# Школьная планета

***НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!***

***№ 8 (55) КРАСАВІК 2019***

*Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”Мінскай вобласці*




***Каманда КВЗ “Па-барабане” - пераможца раённага фестывалю каманд КВЗ “Таленавітая моладзь таленавітая ва ўсім”!***

***Акрамя пераканаўчай перамогі каманды КВЗ “Па-барабане”, Эдуард Шамко названы “містэрам фестывалю”. Каманда пад кіраўніцтвам Івана Пятровіча Яфрэменка таксама адзначана дыпломам за самы лепшы жарт фестывалю.***






# *А якую прафесію выбіраеш ты?*









## *Навучэнцы 10 класаў, якія наведваюць факультатыўныя заняткі “Уводзіны ў аграрную прафесію”, здзейснілі экскурсію на сельгас-прадпрыемствы Бярэзінскага раёна*

***У адпаведнасці з праграмай навучэнцы вывучаюць свет сельскагаспадарчых раслін і жывёл, атрымліваюць уяўленне аб тэхналогіях вытворчасці, умовах захоўвання сельгас-прадукцыі, селекцыі і генетыцы.***

***Школьнікі даведваюцца аб шкодніках і хваробах раслін, знаёмяцца з асноўнымі тыпамі глебы і спосабамі яе апрацоўкі.***

***Хлопцы і дзяўчаты вывучаюць пароды сельскагаспадарчых жывёл і птушак. Ім паказваюць парк сучаснай тэхнікі, электраабсталяванне жывёлагадоўчых ферм.***

***Вялікая ўвага надаецца практычным урокам, якія мяркуюць правядзенне выязных заняткаў, семінараў, экскурсій з мэтай замацавання атрыманых ведаў на практыцы.***

***Матэрыял падрыхтавалі ўдзельнікі экскурсіі***

# А якую прафесію выбіраеш ты?

*29 красавіка ва ўстанове адукацыі адбылася выніковая канферэнцыя “Педагог XXI стагоддзя” навучэнцаў профільнай групы педагагічнай накіраванасці.*

*Мэты канферэнцыі:*

*1. Дэманстрацыя разумення грамадскай і асобаснай каштоўнасці педагагічнай прафесіі.*

*2. Асэнсаванне і шматбаковы аналіз навучэнцамі вынікаў вывучэння курса “Уводзіны ў педагагічную прафесію” і першых практычных крокаў у ролі настаўніка.*

*3. Стымуляванне творчай дзейнасці навучэнцаў-членаў педагагічнай групы.*

*4. Стварэнне ўмоў для ўдасканалення прамоўніцкага майстэрства навучэнцаў як неабходнага элемента іміджу будучага настаўніка.*







# А якую прафесію выбіраеш ты?




*Наведванне ўстановы аховы здароўя “Бярэзінская цэнтральная раённая бальніца”*



*“Шчаслівы чалавек той, які раніцай з задавальненнем ідзе на працу, а вечарам – з радасцю вяртаецца дадому”*

***“Прафесія - гэта асноўны занятак чалавека”***

***Кожны дзень мільёны людзей зранку спяшаюцца на працу. Праца павінна прыносіць чалавеку радасць, бо займае вялікае месца ў жыцці. Дзякуючы працы людзей багацее краіна.***

***А каб праца прыносіла задавальненне, трэба знайсці сабе справу па душы. Выбіраць сабе прафесію па душы справа няпростая, але ў многіх з вас яшчэ ёсць час падумаць і памарыць аб тым, кім вы будзеце, калі вырасціце.***

***Спадзяюся, што ў будучыні вы ўсё выберыце цікавую і карысную працу і станеце майстрамі сваёй справы. Бо добрая праца прыносіць радасць людзям***

# У Беразіно за “Лыжкай Цмока”

***20 красавіка 2019 года на базе Дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа №2 г. Беразіно” адбыўся турнір па інтэлектуальных гульнях “Лыжка Цмока” сярод навучэнцаў 5-7 класаў Міншчыны, у рамках якога адбыўся чэмпіянат Мінскай вобласці па гульнях: “Што? Дзе? Калі?” і камандная “Свая гульня” сярод вучняў 5-7 класаў.***




***Арганізатары турніру:*** *Галоўнае ўпраўленне па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, РГА “БЛІК”, Упраўленне па адукацыі, спорту і турызму Бярэзінскага райвыканкама, Інтэлектуальны цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Бярэзінскага раёна, Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа №2 г. Беразіно”.*



***У праграме турніру адбыліся гульні:***

*“Што? Дзе? Калі?”(30 пытанняў, рэдактар Вадзім Кузміч),*

*Камандная “Свая гульня” (12 тэм, рэдактар Вадзім Кузьміч),*

*“Медыязбука” (клуб “Ігумен” г. Чэрвень і Барыс Батурчык),*

*Гульня-сюрпрыз “Небыліцы Цмока” (ад арганізатараў турніру).*

***У турніры прымалі ўдзел 18 каманд з Мінскай вобласці:***

*«Знаўцы» (ДУА "Гімназія №1 г. Салігорска"), «Na’Vi» (Гуда "Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна"), «Унікум» (ДУА "ВПК яслі сад - сярэдняя школа 24 г. Барысава"), «Венера» (ДУА "Гімназія №3 г. Барысава"), «Tea funny» (ДУА "Дуброўская сярэдняя школа"), «Нерэальная рэальнасць», «Метэор поспеху» (ДУА "Сярэдняя школа №8 г. Жодзіна"), «Nika» (ДУА "Крупская раённая гімназія"), «Лунарыя» (Смалявічы), «Дзеці*

*Еці» (ДУА "Гімназія №1 імя В. А. Караля г. Чэрвеня") «Зебры ў клетку» (ДУА "Сярэдняя школа №4 г. Чэрвеня"), "Акварыум" (ДУА " Смілавіцкая сярэдняя школа №2»), "Пазітыў" (ДУА «Сярэдняя школа №2 г. Беразіно»), "УМКІ" (ДУА «Сярэдняя школа №3 г. Беразіно»), "Не пытанне" (ДУА «Бярэзінская гімназія»), "Пяцёрачка" (ДУА «Сярэдняя школа №5 г. Вілейка»), "Фартуна" (ДУА "Вілейская гімназія №2"). Каманда «Жалезная логіка" (ДУА "Сярэдняя школа №8 г. Жодзіна") прымала ўдзел у гульні па-за залікам.*

***Абсалютным пераможцам турніру і ўладальнікам яго галоўнага прыза – кубка «Лыжка Цмока»*** *(аўтар працы – Народны майстар Беларусі Яўген Паўлавіч Осіпаў)* ***стала каманда «Акварыум»*** *(ДУА "Смілавіцкая сярэдняя школа №2", трэнер Святлана Плахатнюк).*




*Пераможцы гульняў "Што? Дзе? Калі?" і "Свая гульня" сталі ўладальнікамі кубка і дыплома I ступені Галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама. Каманды, якія занялі 2 і 3 месцы ўзнагароджаны дыпломамі II і III ступені Галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама. Пераможцы гульні "Медыяазбука" адзначаны Граматамі ўпраўлення па адукацыі, спорту і турызму Бярэзінскага райвыканкама. Каманда-пераможца ў гульні-сюрпрызе "Небыліцы Цмока"атрымала салодкі прыз.*

*Аргкамітэт выказвае падзяку клубу "Ігумен" г. Чэрвеня і асабіста Ірыне Вабішчэвіч, Барысу Батурчыку, Вадзіму Кузмічу за падрыхтоўку і прадастаўленне гульнявога матэрыялу.*




*Ва ўстанове адукацыі для навучэнцаў і гасцей турніру была арганізавана выстава драўляных лыжак, беларускіх лялек і паясоў "Заўсёды з натхненнем" з калекцыі Ганны Аляксандраўны Ждановіч – заснавальніцы музея драўлянай лыжкі і Народнага клуба майстроў. Для ўсіх жадаючых была афармлена фотазона, дзе кожны мог сфатаграфавацца на фоне маляўнічага банэра і драўлянай лыжкі з гербам горада, зробленай у Бярэзінскім раённым цэнтры рамёстваў.*

*Алена Ждановіч*

# Рэспубліканская добраахвотная акцыя “Тыдзень лесу-2019”




*З 13 па 20 красавіка 2019 г. па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь адбылася Рэспубліканская добраахвотная акцыя “Тыдзень лесу”. Мерапрыемства прымеркавана да Года малой радзімы і 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.*

*У гэтым годзе акцыя “Тыдзень лесу” прайшла ўжо ў 12-ы раз. Як паказвае статыстыка, з кожным годам да акцыі далучаецца ўсё большая колькасць беларусаў.*

*Наша ўстанова адукацыі прыняла актыўны ўдзел у акцыі “Тыдзень лесу-2019”. Мэтай дадзенага мерапрыемства было прыцягненне навучэнцаў да праблем ляснога фонду, папулярызацыя беражлівых адносін да аднаго з галоўных прыродных рэсурсаў краіны, узмацненне экалагічнай, эканамічнай і сацыяльнай ролі лясоў.*

*13 і 20 красавіка 2019 года навучэнцы 7-9 і 11 класаў установы адукацыі прымалі актыўны ўдзел у пасадцы лесу ў Бярэзінскім лясгасе.*









- ***Калі Вы хочаце прыняць удзел у выпусках школьнай газеты.***
- ***Калі Вы пішаце вершы і хацелі б, каб пра гэта даведаліся ўсе.***
- ***Калі ў Вас ёсць цікавыя ідэі, то мы чакаем Вас!***

***Рэдакцыя газеты “Школьная планета” кожны месяц рыхтуе выпуск чарговага нумару.***

***Жадаючых прыняць актыўны ўдзел у стварэнні газеты мы чакаем у 22 аўдыторыі.***

***Пакінем след у гісторыі школы разам!***

***Падтрымайце нас!***

ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета” выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба “Юны журналіст”: Кацярына Бубенька, Паліна Кузіна, Паліна Маркевіч, Вікторыя Лапцёнак, Анастасія Бурая, Марына Лапцёнак, Аліна Жукоўская, Яна Сюмак